# ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВЫХ КАДРАЎ НАЙВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ НА КАФЕДРЫ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН БДУ (1992—2022 гг.)

***А. В. Гурын***
*Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,*
*вул. Маскоўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь, e-mail: mpp.iup@mail.ru*

*Разгледжана спецыфіка падрыхтоўкі навуковых кадраў найвышэйшай кваліфікацыі на кафедры міжнародных адносін БДУ у 1992—2022 гг.; прааналізаваны асноўныя накірункі дысертацыйных даследаванняў у азначаны перыяд; прыводзіцца кароткі змест найбольш значных прац.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыя міжнародных адносін; знешняя палітыка; навуковае даследаванне; дысертацыя.*

# PREPARING OF HIGHLY QUALIFIED SCIENTIFIC PERSONNEL AT THE DEPARTMENT OF INTERNATIONAL RELATIONS OF BSU (1992—2022)

***A. V. Huryn***
*Academy of public administration under the President of the Republic of Belarus,*
*Moskovskaya Str., 17, 220007, Minsk, Belarus, e-mail: mpp.iup@mail.ru*

*The specifics of the training of highly qualified scientific personnel at the Department of International Relations of BSU in 1992—2022 are considered; the main directions of dissertation research in this period are analysed, a summary of the most important works is given.*

***Keywords:*** *history of international relations; foreign policy; scientific research; dissertation.*

Стварэнне ў 1992 г. кафедры міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта было абумоўлена шэрагам прычын. Па-першае, новая кафедра стваралася ў мэтах падрыхтоўкі беларускіх спецыялістаў для Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Па-другое, кафедра павінна была стаць вучэбна-метадычным цэнтрам вышэйшай школы краіны ў галіне міжнародных адносін. Па-трэцяе, на базе кафедры планавалася стварыць навукова-арганізацыйны цэнтр, які б каардынаваў намаганні беларускіх даследчыкаў у галіне міжнародных адносін.

Ужо ў першыя гады свайго існавання кафедра сабрала ў свой склад вядомых і аўтарытэтных спецыялістаў у галіне вывучэння знешнепалітычных праблем. З 1 верасня 1992 г. на ёй працавалі дактары гістарычных навук, прафесары А. В. Шарапа (загадчык кафедры з моманту стварэння і да 2015 г.), А. А. Разанаў, А. А. Чалядзінскі; кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л. В. Лойка (абараніў доктарскую дысертацыю ў 2003 г.). У верасні 1993 г. на кафедру прышоў з Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі

У. Е. Снапкоўскі, які абараніў у 1993 г. доктарскую дысертацыю па праблемах знешнепалітычнай дзейнасці БССР 1944—1953 гг. З першых гадоў існавання кафедры тут працавалі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты Н. Я. Аблава, С. Ф. Свілас, Л. М. Хухлындзіна. З другой паловы 1990—х гг. калектыў кафедры папоўнілі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты А. І. Гардзейчык, У. А. Елфімаў, Р. М. Турарбекава, У. В. Фральцоў, М. Э. Часноўскі, В. Г. Шадурскі (двое апошніх абаранілі доктарскія дысертацыі ў 2000 г.); кандыдаты палітычных навук, дацэнты А. А. Дастанка і Ю. І. Малевіч (абараніла доктарскую дысертацыю ў 2005 г.). Па сваім кадравым патэнцыяле кафедра міжнародных адносін у канцы 1990-х — пачатку 2000-х гг. была і застаецца зараз, адным з самых кваліфікаваных падраздзяленняў БДУ і ўсёй сістэмы ўстаноў вышэйшай адукацыі Беларусі. Зразумела, што такі стан кафедры непарыўна звязана з эфектыўнай работай па падрыхтоўцы кадраў найвышэйшай навуковай кваліфікацыі.

У савецкі перыяд развіцця навукі міжнародных адносін у Беларусі ў даследчыкаў было няшмат магчымасцяў для напісання дысертацый, у першую чаргу доктарскіх, па міжнароднай тэматыцы, паколькі такія даследаванні лічыліся «прэрагатывай Масквы». На першым этапе існавання незалежнай Беларусі ў галіне развіцця гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі адзначаліся негатыўныя тэндэнцыі, характэрныя для гістарычнай навукі ўвогуле, у першую чаргу звязаныя са зменай пакаленняў даследчыкаў і скарачэннем фінансавання фундаментальнай навукі, што стала прычынай некаторага адтоку кадраў з галіны.

Нягледзячы на стварэнне ў 1992 г. кафедры, а ў 1995 г. — факультэта міжнародных адносін, першы (і адзіны у айчыннай гісторыі) спецыялізаваны Савет па абароне дысертацый па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» быў створаны ў БДУ толькі ў 1998 г. і праіснаваў да 2005 г. Гэтым тлумачыцца параўнальна невялікая колькасць дысертацый, абароненых па міжнароднай тэматыцы ў першай палове 1990-х гг. Сітуацыя змянілася ў канцы 1990-х гг., калі адзначаецца рост міжнародных даследаванняў, што звязана, у тым ліку і з функцыянаваннем кафедры міжнародных адносін. Аднак, пасля істотнага колькаснага і якаснага росту міжнародных даследаванняў у другой палове 1990-х гг. — першай палове 2000-х гг. працэс падрыхтоўкі і абароны дысертацый істотна запаволіўся ў другой палове 2000-х — 2010-х гг., аднак у параўнанні з савецкім перыядам якасныя вынікі развіцця міжнародных даследаванняў былі больш багатыя. Зразумела, што адной з асноўных прычын гэтага стала прыпыненне існавання спецыялізаванага Савета па абароне дысертацый.

Першай у краіне кандыдацкай дысертацыяй, абароненай па спецыяльнасці «Гісторыія міжнародных адносін і знешняй палітыкі», стала кандыдацкая дысертацыя А. І. Гардзейчыка (1998 г.) «Палітычныя і эканамічныя ўзаемаадносіны Рэспублікі Беларусь і Расійская Федэрацыі ў першай пал. 1990-х гг.» (на рус. мове). Яна была абаронена ў спецыялізаваным Савеце па абароне дысертацый, створаным на кафедры міжнародных адносін БДУ. У снежні 2000 г. у гэтым жа Савеце упершыню ў краіне былі паспяхова абаранены доктарскія дысертацыі па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» М. Э. Часноўскім і В. Г. Шадурскім. Усяго ў Савеце з 1998 г. па 2005 г. было абаронена 4 доктарскія і 26 кандыдацкіх дысертацый. Спыненне існавання самастойнага Савета по абароне дысертацый па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» сур'езным чынам сказалася на падрыхтоўцы спецыялістаў-міжнароднікаў найвышэйшай кваліфікацыі, выніковасці работы аспірантур у гэтай галіне.

Спыненне працы самастойнага Савета, без сумневу, прывяло да скарачэння колькасці абарон — спецыяльнасць «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» была адкрыта для абароны ў спецсавете БДУ па гістрычных навуках Д.02.05.01, дзе прымаліся да абароны дысертацыі яшчэ па трох гістарычных спецыяльнасцях, у тым ліку па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя», па якой традыцыйна найбольш абарон. У перыяд з 2006 па 2021 г. па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» было абаронена 6 доктарскіх і 18 кандыдацкіх дысертацый.

Усяго ў перыяд з 1992 па 2022 г. супрацоўнікамі кафедры міжнародных адносін, а таксама дактарантамі і аспірантамі, якія працавалі пад іх кіраўніцтвам, было абаронена 8 доктарскіх (2 работы па 2 спецыяльнасцях) і 46 кандыдацкіх дысертацый: па спеціальнасці 07.00.15 — 48 дысертацый; па іншых спецыяльнасцях — 6; усяго 54 работы.

Тэматыка дысертацыйных даследаванняў у галіне тэорыі і гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі ў постсавецкі перыяд значна змянілася, хоць і месцілася на падмурку, замацаваным у 1980—я гг.

Даследаванні навукоўцаў кафедры ажыццяўляліся ў межах двух буйных накірункаў навукова-даследчай работы: даследаванне гісторыі і зместу сучаснай знешняй палітыкі Беларусі і даследаванне агульнай гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краінаў.

Тэматыка дысертацый у галіне гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ў постсавецкі перыяд значна пашырылася, сягнуўшы

ўглыб вякоў, да пачаткаў беларускай дзяржаўнасці. Працягваючы вывучэнне сувязяў Беларусі з замежнымі краінамі ў перыяд пасля 1944 г. (В. Г. Шадурскі (доктарская), П. У. Малашук, С. Ф. Свілас (доктарская) У. Е. Снапкоўскі (доктарская) [1], навукоўцы кафедры больш увагі сталі надаваць знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў 1920—я гг. (Т. Я. Паўлава, В. М. Цынкевіч) [2], знешняй палітыцы Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (С. А. Лашкевіч) [3] і інш.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. сфарміраваўся новы накірунак даследаванняў — вывучэнне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У гэтай галіне працавала і працуе шмат даследчыкаў, сярод якіх можна адзначыць доктарскія і кандыдацкія дысертацыі (за выключэннем ужо згаданых раней), якія абаранілі А. У. Русаковіч (кандыдацкая і доктарская), А. І. Гардзейчык, К. В. Шых, Е. У. Навошчык, А. У. Селіванаў, У. Я. Улаховіч і інш. [4].

У 1990-я гг. стала фарміравацца і беларуская школа даследаванняў у галіне тэорыі і гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін; тэматыка даследаванняў у постсавецкі перыяд значна змянілася, хоць і месцілася на падмурку, замацаваным у 1980-я гг. Як і ў выпадку з гісторыяй знешнепалітычнай дзейнасці БССР, даследчыкі кафедры, працягваючы вывучэнне ранейшых тэм, адкрылі новыя праблемы.

Гісторыя міжнародных адносін у 1945—1990 гг. у постсавецкі перыяд даследавалася даволі актыўна; першапачаткова вывучэннем праблематыкі займаліся вучоныя, якія працавалі ў гэтай галіне ў 1970—1980-я гг., аднак у 2000—2010-я гг. такія даследаванні сталі выконваць больш маладыя навукоўцы. Доктарскую працу ў гэты перыяд выканаў і абараніў Л. В. Лойка; кандыдацкія — А. П. Рубо, Е. А. Дубінко-Гушча і інш. [5]

Вывучэнне міжнародных адносін у постсавецкі перыяд — адзін з галоўных накірункаў міжнародных даследаванняў супрацоўнікаў кафедры. У яго межах беларускімі вучонымі быў распрацаваны цэлы шэраг актуальных праблем міжнароднай палітыкі, такіх як: аб'яднанне Германіі і яе сувязі з Рэспублікай Беларусь; месца і роля краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў міжнародных адносінах; пабудова новай сістэмы міжнароднай бяспекі і роля міжнародных арганізацый у гэтых працэсах; інтэграцыйныя працэсы ў Еўропе і на постсавецкай прасторы. Доктарскія дысертацыі па дадзенай праблематыцы абаранілі М. Э. Часноўскі, Л. М. Гайдукевіч, У. В. Фральцоў (кандыдацкая і доктарская); кандыдацкія — П. А. Патапейка, І. У. Вінакурава, І. У. Зуеў, В. М. Бычкоўская, У. У. Васількоў і інш. [6].

Важным накірункам навукі міжнародных адносін у 1990-я — 2010-я гг. стала даследаванне інтэграцыйных працэсаў ў Еўропе. Гэтая праблематыка даследавалася такімі навукоўцамі як А. А. Дастанка, Т. В. Варатніцкая, А. М. Садоўская, А. А. Валодзькін, А. М. Чыж [7].

Яшчэ адзін накірунак міжнародных даследаванняў кафедры міжнародных адносін, які стаў актыўна развівацца ў постсавецкі перыяд — знешняя палітыка краін Азіі і Афрыкі. Важнай асаблівасцю навуковых распрацовак у гэтай сферы з'яўляецца параўнальна вялікая колькасць прац, абароненых замежнымі даследчыкамі. Кандыдацкія дысертацыі па гэтай праблематыцы абаранілі Дзіба Кава Юсэф, Аль—Катуанех Ахмад Гані, Рашыдзі Асад, Сахаб Ахмед Алі Нур, Алі Асам Абед Алі, Салум Ферас, Эльмалян Абдурааф Салах [8]. Айчынныя даследчыкі таксама даследавалі праблемы знешняй палітыкі краін Азіі і Афрыкі; сярод іх Н. Я. Аблава (доктарская дысертацыя), Д. Л. Шавялёў, М. В. Шавялёва, Я. В. Чаркаскі, В. В. Вcovering Вармановіч, В. Р. Баравы, А. С. Іокша, М. У. Даніловіч, С. М. Віткоўскі і інш. [9].

Таксама трэба звярнуць увагу на палітычныя праблемы міжнародных адносін, якія таксама даследаваліся на кафедры міжнародных адносін. Вынікам міжнародна-палітычных даследаванняў стала абарона дысертацый Ю. І. Малевіч (кандыдацкая і доктарская); І. Ю. Рублеўскім — кандыдацкая [10].

Гістарыяграфія міжнародных даследаванняў у Беларусі стала прадметам дысертацыйнага даследавання А. В. Гурына «Даследаванні гісторыі міжнародных адносін у Беларусі у 1980—2003 гг.» [11].

Такім чынам, найбольш даследаваннымі тэмамі на дысертацыйным узроўні на кафедры міжнародных адносін у 1992—2022 гг. сталі: знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай; міжнародныя аспекты дзяржаваўтваральных працэсаў на тэрыторыі Беларусі і знешнепалітычная дзейнасць БНР і БССР ў 1918—1920-я гг., а таксама ў міжваенны перыяд; знешнепалітычная дзейнасць БССР пасля 1944 г.; знешняя палітыка незалежнай Беларусі. Найбольш даследаванымі ў галіне гісторыі знешняй палітыкі замежных краінаў заставаліся германская праблематыка, месца і роля краін Цэнтральнай і Сярэдняй Еўропы ў міжнародных адносінах, праблемы міжнароднай бяспекі; сталі развівацца даследаванні гісторыі і актуальных праблемаў знешняй палітыкі краін Азіі і Афрыкі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Малашук, П. В. Белорусско-югославские отношения (1953—2003 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 22 с.;

Свилас, С. Ф. ЮНЕСКО в системе внешнеполитической деятельности Белорусской ССР (1954—1964 гг.): автореф. дис. ... д-ра. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2018. — 47 с.; Снапковский, В. Е. Внешнеполитическая деятельность Белорусской ССР (1944—1953 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02 / Инст. истории АН БССР. — Минск, 1992. — 45 с.; Шадурский, В. Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945—1990-е гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2000. — 37 с.

2. Лашкевіч, С. А. Знешнепалітычная актыўнасць Вялікага княства Літоўскага пасля заключэння Люблінскай уніі (1569—1600 гг.): аўтареф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.15 / Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, 2007. — 24 с.

3. Павлова, Т. Я. Внешнеполитическая деятельность Белорусской Народной Республики в 1918-1920 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Мн, 2001. — 20 с.; Цынкевіч, В. М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай рэспублікай у 1921—1929 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2004. — 20 с.

4. Гордейчик, А. И. Политические и экономические взаимоотношения Республики Беларусь и Российской Федерации в 1-й половине 1990-х гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05 / Белорус. гос. ун-т. — Минск, 1998. — 19 с.; Навощик, Е. В. Белорусско-шведские отношения (1991-2017 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Белорус. гос. ун-т. — Минск, 2019. — 24 с.; Русакович, А. В. Белорусско-германские отношения в 1990-х гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05. / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2000. — 20 с.; Русакович, А. В. Германия во внешней политике Беларуси (1990—2015 гг.): автореф. дис. ... д-ра. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2016. — 52 с.; Селиванов, А. В. Международное сотрудничество Республики Беларусь по формированию национальной системы защиты беженцев: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Белорус. гос. ун-т. — Минск, 2007. — 24 с.; Улахович, В. Е. Становление и особенности внешней политики Республики Беларусь (1991—2005 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Белорус. гос. ун-т. — Минск, 2012. — 25 с.; Ших, К. В. Белорусско-израильские отношения (1992-2015 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Белорус. гос. ун-т. — Минск, 2019. — 26 с.

5. Дубинко-Гуща, Е. О. Внешняя политика Дании (1972-2012 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2014. — 24 с.; Лойко, Л. В. От коммунизма к социал-демократии: трансформация левой партии в Польше (1970—2000 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.03, 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2003. — 67 с.; Рубо, О. П. Внешнеполитический курс Европейского союза по отношению к Китайской Народной Республике (1975—2016 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2018. — 24 с.

6. Бычковская, О. М. Трансатлантические отношения в сфере международной безопасности во внешнеполитической стратегии США (2001—2013 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2015. — 23 с.; Васильков, В. В. Политика Италии в регионе Ближнего, Среднего Востока и Северной Африки в 2001—2009 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2011. — 24 с.; Винокурова, И. В. Международное сотрудничество по противодействию терроризму в 1990—2000-е годы: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 23 с.; Гайдукевич, Л. М. Туризм в международных отношениях стран Центральной и Восточной Европы (1989—2009 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2010. — 49 с.; Зуев, И. В. Европейское направление внешней политики Швейцарии в 1991-2016 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2021. — 25 с.; Потапейко, П. О. Североирландский конфликт в международных отношениях в 90-е гг. XX в.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05. / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2001. — 22 с.; Фрольцов, В. В. Политика ФРГ

в отношении постсоветских государств (1991-2005 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2017. — 38 с.; Фрольцов, В. В. Восточногерманский фактор и его влияние на внутреннюю и внешнюю политику ФРГ в 90-е гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.03, 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2001. — 21 с.; Часноўскі, М. Э. Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989—1999 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.03, 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2000. — 37 с.

7. Володькин, А. А. Трансформация отношений ЕС и НАТО с государ-ствами Балтийского региона в 1991—2004 гг. автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2009. — 24 с.; Воротницкая, Т. В. Политика расширения Европейского Союза на Восток в конце 1980-х—2004 годах: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2004. — 22 с.; Достанко, Е. А. Европейское сообщество государств как международная система: процессы реструктуризации на рубеже XX—XXI ст.: автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 1998. — 22 с.; Садовская, А. Н. Политика Европейского Союза в отношении развивающихся государств в 1990-е—2000-е годы: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 25 с.; Чиж, А. М. Энергетическая политика Европейского Союза в 2006-2014 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2017. — 25 с.

8. Али Осам Абед Али. Внешняя политика Ирака в 2003—2014 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2015. — 24 с.; Аль-Катуанех Ахмад Гани. Роль Иордании в развитии мирного процесса на Ближнем Востоке в 90-е гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2001. — 20 с.; Дибо Кава Юсеф. Курдский вопрос в международных отношениях на Ближнем и Среднем Востоке (1918—1990 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 1999. — 21 с.; Рашиди Асад. Региональные и международные аспекты борьбы курдского народа за самоопределение (80—90-е гг. XX века): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2003. — 19 с.; Саллум Ферас. Роль Сирии в межарабских отношениях на Ближнем Востоке (1991—2003 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2011. — 22 с.; Сахаб Ахмед Али Нур. Ирако-американские отношения (1980—2003 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2016. — 24 с.; Эльмалян Абдураоф Салах Приоритеты внешней политики Ливийской Джамахирии (1969—2003 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2010. — 24 с.

9. Аблова, Н. Е. КВЖД и российская эмиграция в Китае: международные и политические аспекты истории (первая половина XX в.): дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.03. — М., 2005. — 555 с.; Боровой, В. Р. Политика КНР в Центральной Азии (90-е годы XX — начало XXI в.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 20 с.; Витковский, С. М. Политика США в отношении КНР в период президентства Дж. Буша-младшего: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2013. — 26 с.; Воронович В. В. Проблема безопасности во внешней политике Казахстана в 1990-е гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2003. — 20 с.; Данилович, М. В. Центральноазиатский вектор внешней политики КНР в 2001-2013 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2015. — 24 с.; Иокша, А. С. Восточный Иерусалим в иордано-палестинских отношениях (1949—2006 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2011. — 25 с.; Черкасский, Я. В. Международная и региональная безопасность арабских стран Персидского залива (90-е гг. XX — начало XXI века): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 20 с.; Шевелёв, Д. Л. Генезис палестинской проблемы. 1882—1917 г.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.05 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2000. — 21 с.; Шевелёва, М. В. Процесс палестино-израильского урегулирования

(1991—2001 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 19 с.

10. Малевич, Ю. И. Отражение принципов концепции прав человека во внешнеполитических доктринах США (70—80-е годы): автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.01 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 1995. — 18 с.; Малевич, Ю. И. Эволюция концептуальных подходов к правам человека в условиях глобализации: автореф. дис. ... д-ра полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 38 с.; Рублевский, И. Ю. Место и роль политических институтов Бразилии в международном и региональном сотрудничестве: автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2018. — 25 с.

11. Гурын, А. В. Даследаванні гісторыі міжнародных адносін у Беларусі у 1980—2003 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Бел. гос. ун-т. — Минск, 2005. — 19 с.